Ямаціна Н.А., студ. гр. 202 ФКіСКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Клімаў І.П.,
канд. філал. навук

# МАСТАЦКІЯ ВАРТАСЦІ КУПАЛАВЫХ ТВОРАЎ

*На золаку 20-га стагоддзя, калі Расію ўскалыхнулі хвалі першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, на Беларусі заззяў вясёлкай цудоўны самародак, непаўторна вялікі талент, выразнік запаветных дум і светлых надзей народа – Янка Купала…*

*У.Юрэвіч*

"Выключнай сілы паэтычны талент падаравала Янку Купалу прырода, а рэвалюцыя дапамагла гэтаму таленту раскрыцца перад народам" (1, с.19). Яркай зоркай на небасхіле беларускай літаратуры заззяў Іван Дамінікавіч Луцэвіч у 20-м стагоддзі. "Спалучыўшы ў сабе талент мастака з пафасам змагара, Янка Купала арганічна аб'яднаў у сваёй творчасці шырыню гістарычнага кругагляду з вострым адчуваннем сучаснасці. […] Народна-гутарковае слова і "кніжнае" ідуць у творчасці Янкі Купалы побач, яны падпарадкаваны адной мэце – паказаць духоўнае ўзвышэнне чалавека, якому наканавана было ладзіць новае жыццё, асветленае зарою вялікіх гістарычных перамен" (3, с.19).

Літаратурная спадчына Я. Купалы ўражвае: драмы, паэмы, вершы… Але не ў колькасці твораў заключана багацце, якое падарыў нам паэт. Яго прыгожая мова, яскравыя вобразы, ёмкія літаратурныя тропы, выключныя сюжэты, высокі ўзровень перапрацоўкі фальклорных матываў даюць падставу называць гэтага сына Беларускай зямлі сапраўдным аксамітам літаратуры.

Янку Купалу нездрама называюць тытанам беларускай літаратуры. Яго тытанізм праяўляецца ў шэрагу параметраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Ён унес вялікі ўклад у развіццё публіцыстычнай літаратуры. Вершы “А хто там ідзе?”, “Мужык”, “Гэй, наперад!”, “Думкі” і іншыя не толькі раскрываюць хваляванні аўтара за родную старонку, але і змяшчаюць прызыў аглядзецца, прабудзіцца, бегчы “к долі, к волі…”. Тут жа Купала “вынаходзіць” і асаблівыя формы для вершаў: дыялог (“А хто там ідзе?”, “Хто ты гэткі?”) і верш-заклік, верш-зварот (“Маладая Беларусь”, “Не ўздыхай”, Песняру-беларусу” і інш).

2. Пейзажная і інтымная лірыка. Не толькі ў публіцыстычнай галіне моцна праявіўся паэт. Яго лірычныя вершы пра хараство роднай прыроды (“Летняя раса”, “Лясное возера”, “Зімой у лесе” і інш), пра каханне (“Пакахай мяне, дзяўчынка…”, “Явар і каліна”, “Не глядзі…” і да т.п.) і па сёняшні дзень з’яўляюцца ўзорамі для многіх маладых і сталых паэтаў:

І лягла ж цішына
У бары за гарой, -
Каб дравінка адна
Хоць кіўнула сабой.

Снег пушаны залёг
На галінах сасон,
І чарнобель, і мох
Атуліў сабой ён.

3. Фальклёрных сюжэты ў творчасці Купалы. “Ранняя купалаўская паэзія ўбірала з фальклору перш за ўсё тыя матывы і вобразы, дзе праяўлялася самабытнасць народнага мыслення і светаадчування, і ўбірала не стыхійна, а з мэтанакіраваным адборам […]. А гэта азначала, што Купала не толькі наследваў традыцыі беларускай паэзіі мінулага стагоддзя, але і ўпэўнена развіваў, узбагачаў іх, выпрацоўваў арыгінальны падыход да фальклору”. (4, с.10). Вобразы Бандароўны, Машэкі, Гусляра і многія іншыя ўражваюць сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яскравасцю, жыццёвым моцам, рэальнасцю, якія праяўляюцца ў кожным радку апісання:

Хараства такога ў свеце
Не было, не будзе;
Аб ёй людзі гаварылі,
Як аб нейкім цудзе.

Як маліны, яе губкі,
А твар, як лілея,
Як дзве зоркі яе вочы,
Гляне – свет яснее

У паэме "Курган" аўтар малюе вобраз сапраўднага, вольнага духам паэта-гусляра, а сам твор падобны да старажытнага казання:

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, -
Ўдзірванелы курган векавечны. […]

На купалле там птушка садзіцца, пяе
У піліпаўку воўк нема вые;
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.

Некалькі радкоў – і ўжо гатовы малюнак таямнічай старажытнасці стаіць перад намі. "Прыёмы фальклорнай паэтыкі ў вершах Купалы набываюць самастойнае творчае значэнне". (3, с.71). Выкарыстанне прымавак ("Касьба"), песенных зачынаў і паралелізмаў ("З песень нядолі" ці "Шумныя бярозы"), а таксама народных вобразаў і сімвалаў ("Я бачыў", "Над ракою ў спакою" і інш)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

надаюць творам асаблівы лірычны настрой, блізкасць кожнаму сэрцу, кожнай душы:

Я бачыў усё гэта й душою цярпеў,
Застыў смех на губах і песні не пеў,
Заплакаў, заліўся маркотнай слязінкай
Адзін над *бярозкай, галубкай, дзяўчынкай.*

Але "зварот да фальклорных багаццяў зусім не азначае, што Купала займаўся толькі іх паэтычнай інтэрпрытацыяй, пераказам ці тлумачэннем. Ён валодаў магутнай творчай фантазіяй мастака, каб, адштурхнуўшыся ад фальклорнага вобраза, стварыць свой самабытны паэтычны свет" (3, с.73).

4. Мастацкія тропы і літаратурныя прыёмы. Янка Купала і па сённяшні дзень лічыцца неператвершаным майстрам літаратурнай мастацкай мовы. Яго ёмкія і яскравыя тропы – сапраўдныя шэдэўры літаратурнай мовы. Вось толькі некаторыя яго эпітэты: *святая песня, лета прыгожа-квяцістае, наспелая постаць шчаслівых пасеваў, свабоднае слова* і г.д.; метафары: *песня плыве, губляючы ў пушчы свае пералівы, плача-галосіць у коміне вецер глухі, рэха панеслася – бор адказаў* і г.д.; параўнанні, паўторы (прысутнічаюць у вершах "Ноч за ночкай…", "За годам год" і інш), увасабленні, звароты (прысутнічаюць у вершах "Брату ў чужыне", "Маладая Беларусь", Аратаму", "Касцам" і інш). Усе гэтыя непаўторныя купалаўскія тропы вызначаюць яго паэзію як асаблівую з'яву беларускай літаратуры. Гэтымі тропамі мы захапляемся і па сённяшні дзень. Толькі шчырая любоў да звычайнага селяніна магла дапамагчы стварыць Купале такія вядомыя кожнаму і адначасова новыя па сваіх якасцях вобразы:

Я мужык-беларус, -
*Пан* сахі і касы;
Цёмен сам, белы вус,
Пядзі дзве валасы.
*("Я мужык-беларус…")*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як сама царыца
У залатой кароне,
Йдзе яна ў вяночку
Паміж спелых гоняў.
*("Жняя")*

Такіх вобразаў – пана і царыцы для простых сялян – да Купалы не маляваў у беларускай літаратуры ніхто. У кожным яго творы, у кожным радку гучыць любоў да роднай зямлі, боль за пакуты Радзімы, заклік да народа. Шмат твораў, вартых самай высокай адзнакі, стварыў за сваё не вельмі доўгае, але вельмі складанае жыццё паэт. І кожны чытач знойдзе ў Купалы нешта роднае, адметнае, сваё…

Для мяне, напрыклад, гэтым адметным сталі паэма "Курган" і верш "Спадчына". Кранае душу кожны радок, кожнае слова гэтых твораў. Здаецца, што паэт быццам адлюстраваў мае думкі, прычым адлюстраваў так, як бы я ніколі не змагла выказаць. І мімаволі хочацца сказаць "дзякуй, добры чалавек!", чалавеку, якога ўжо даўно няма ў нашым свеце, але чыі творы жывуць і сёння.

Літаратура:

1. Купала, Я. Выбранае / Я. Купала. – Мн.: "Мастацкая літаратура", 1980.
2. Купала, Я. Паэмы, драматычныя творы / Я. Купала. – Мн.: "Мастацкая літаратура", 1989.
3. Юрэвіч, У. Янка Купала: Нарыс жыцця і творчасці / У. Юрэвіч. – Мн.: "Народная асвета", 1983.

Ярош, М. Пясняр роднай зямлі: жыццё і творчасць Янкі Купалы / М. Ярош. – Мн.: "Навука і тэхніка", 1982.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ